Весці БДПУ. Серыя 1. 2020. № 3. С. 49–52

УДК 811.161.3’366.521+811.161.3’366.545

# ФУНКЦЫЯНАВАННЕ Ў СМІ НАЗОЎНІКАЎ МУЖЧЫНСКАГА РОДУ Ў МЕСНЫМ СКЛОНЕ АДЗІНОЧНАГА ЛІКУ

**К. Д. Ганчарэнка**,
*старшы навуковы супрацоўнік, кандыдат філалагічных навук Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі*

Паступіў у рэдакцыю 15.07.20.

UDC 811.161.3’366.521+811.161.3’366.545

# FUNCTIONING OF SINGULAR MASCULINE NOUNS IN PREPOSITIONAL CASE IN MASS MEDIA

**K. Hancharenka,**
*Senior Researcher, PhD in Philology, Center of Research in Belarusian culture, language and literature, NAS of Belarus*

Received on 15.07.20.

Дадзены артыкул даследуе спецыфіку функцыянавання назоўнікаў мужчынскага роду ў месным склоне адзіночнага ліку ў друкаваных выданнях 2001–2019 гг. Прыводзяцца падлікі, якія ўказваюць на рэдкае ўжыванне асабовых назоўнікаў. Сярод прычын бачыцца разыходжанне лінгвістычных поглядаў на прынцыпы ўжывання канчаткаў асабовых назоўнікаў з цвёрдай асновай. Разглядаюцца і прагматычныя фактары: абмежаваная колькасць значэнняў лексем з прыназоўнікамі пры ўказанні на чалавека, канкурэнцыя канструкцый «прыназоўнік *аб* і назоўнік у месным склоне» і «прыназоўнік *пра* і назоўнік у вінавальным склоне». Аналізуецца магчымасць і рэальная практыка ўжывання неасабовых назоўнікаў з асновай на *г, х* у месным склоне з канчаткам *-е* і марфаналагічным чаргаваннем ў аснове. Прыводзяцца статыстычныя звесткі, якія паказваюць на перавагу меснага склону ў параўнанні з давальным у канструкцыях «прыназоўнік *па* з неасабовым назоўнікам».

*Ключавыя словы*: сучасная беларуская мова, сродкі масавай інфармацыі, назоўнікі мужчынскага роду, прыназоўнікі, месны склон.

The article researches the specificity of using singular masculine nouns in prepositional case in printed editions of 2001–2019. It presents the calculations which show the rare using of proper names. Among the reasons there is divergence of linguistic views on the principles of using the endings of proper names with hard stem. It considers pragmatic factors as well: limited number of lexeme meanings with prepositions referring to a person, competition of constructions “preposition “аб” and noun in prepositional case” and “preposition “пра” and noun in accusative case”. It analyzes the possibility and real practice of using nonpersonal nouns with the stem with г, х in prepositional case with the ending –е and morphonologic interchange in the stem. It gives statistic information which shows the predominance of prepositional case in comparison with dative in the constructions “preposition “па” with nonpersonal noun”.

*Keywords:* modern Belarusian language, mass media, masculine nouns, prepositions, prepositional case.

**Уводзіны.** Тэксты сучасных СМІ выступаюць базай узнікнення і замацавання пэўных маўленчых тэндэнцый, выяўляюць стаўленне карыстальнікаў мовы да дыскусійных лінгвістычных момантаў, ***што праяўляецца ў актывізацыі альтэрнатыўных форм, невыкананні нарматыўных рэкамендацый***. Працэсы ўзаемадзення нормы і практыкі можна прасачыць на прыкладзе ўжывання ў друку назоўнікаў мужчынскага роду ў ***месным склоне адзіночнага ліку***[1]. І. Р. Шкраба мяркуе, што адхіленні ад кадыфікаваных устанаўленняў (напрыклад, *пры дзеду – пры дзедзе, па футболу – па футболе, у баю – у баі, у цяні – у ценю* і інш.) могуць быць звязаныя і з фактарам індывідуума [1, с. 120–121]. Прычыны граматычнай варыянтнасці (напрыклад, *па тэлефоне – па тэлефону*) І. П. Клімаў бачыў у функцыянаванні двух правапісаў [2, с. 15]. Г. І. Малько кажа аб міжмоўнай інтэрферэнцыі ў тэкстах СМІ: *на дн**е** нараджэння, у ра**ю**, па перапіс**і*** [3, с. 76–78], *па кожнаму раздзелу альбома* [4, с. 266].

У СМІ 2000-х гг. назіралася як і ўжыванне асабовых назоўнікаў з усімі тыпамі асновы з канчаткам *-у(-ю)*, так і скланенне іх як неасабовых [5, с. 12]. Варыятнасць канчаткаў назоўнікаў м. р. з цвёрдай асновай, лічым, выклікана існаваннем двух палярных тэзісаў: канчатак *-е* рэкамендуецца «незалежна ад значэння слова» [6, с. 262], але «значэнне асобы канчатка *-у* (М.), – спецыфічная з’ява беларускай мовы» [7, с. 15]. Адзначалі варыянтнасць нарматыўнай падачы і абаранялі пазіцыі канчатка *-у* для асабовых назоўнікаў з цвёрдай асновай замест *-е*, які «разбурае катэгорыю асабовасці» П. У. Сцяцко [8, с. 55], А. Р. Хромчанка [9, с. 219]. Заўважым, што лексема *дзед* падаецца з канчаткам *-е* ў «Слоўніку беларускай мовы» (2012), «Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы» (2016) і інш., з *-е/-у* ў «Граматычным слоўніку назоўніка», 2008, 2013 і інш. Праблему ўжывання ўказаных асабовых форм А. А. Каўрус лічыць цяжка вырашальнай [10, с. 43]. П. П. Жаўняровіч раіць супрацоўнікам рэдакцый замяняць складаныя канструкцыі, напрыклад, на В. скл.: *пра дзеда* [6, с. 262]. Адбыліся і змены стылістычнага плана. Калі ў пачатку 2000-х гг. лічылася, што *аб* шырэй прадстаўлены ў афіцыйна-справавым, навуковым і публіцыстычным стылях [11, с. 6], то зараз сфера яго выкарыстання зводзіцца да афіцыйна-справавой [12, с. 263]. Прыназоўнік *пра* ўказваецца як стылістычна нейтральны [7, с. 65].

Адносна новых запазычаных назоўнікаў з асновай на *г, х* варта прасачыць, наколькі часта яны ўжываюцца з канчаткам *-е* і зменай апошняга зычнага асновы. У «Кароткай граматыцы…» (2007) прыведзена 15 назоўнікаў, якія часам ужываюцца з *-е*: (*на, аб*) *допінзе, маналозе, мітынзе* і інш. [13, с. 138]. Слова ***каталог*** падаецца *ў* «Тлумачальным слоўніку…» 1977–1984, 2005 і 2016 гг. ***з флексіяй** -е.* У «Граматычным слоўніку назоўніка» (2013) акрамя *каталогу/-озе* астатнія запазычаныя адзінкі ўказваюцца з канчаткам *-у*: *слэнгу, ліфтынгу,*

[1] Далей падаецца скарочана – м. р., М. скл., адз. л.

*дыптыху.* Канчатак *-е* падаецца толькі ў словах славянскага паходжання: *астрозе*, *беразе*, *снезе*, *паверсе* і *глогу/-зе*, *гароху/-се*, *кажуху/-се* (усяго 16 з *-е,* 7 з *-е/-у*). Ужыванне ва ўкраінскіх СМІ запазычанняў з пераходам *[г], [к], [х]* у аснове ў *[з'], [ц'], [с']*: *на рынзі, на мітинзі, у Фейсбуці* станоўча расцэньваюцца як «намаганне вярнуць украінскай мове яе нацыянальную спецыфіку» [14]. У рускай мове варыянтныя канчаткі М. скл. адз. л. могуць выражаць розныя значэнні ў сказе: *-е* 'аб'ект дзеяння' (*вспоминали о* <…> *морском береге*), *-у* 'акалічнасць месца' (*загорали на берегу*) [15, с. 13–14]. У польскай мове запазычанні засвойваюцца з канчаткам *-u*: *briefing-u, dyptych-u, kick-boksing-u* («Słownik wyrazów obcych PWN z przykładami i poradami», 2018).

Рэкамендацыі ўжываць канструкцыі «*па* + назоўнік м. р.» з М. скл. у большасці значэнняў упершыню з'явіліся ў дапаможніках «Сучасная беларуская мова» пад рэд. Л. М. Грыгор'евай (Мінск, 2006), «Беларуская мова» пад рэд. Л. І. Злобін (Віцебск, 2008). Пры гэтым М. І. Канюшкевіч у выданні «Беларускія прыназоўнікі і іх аналагі. Граматыка рэальнага ўжывання. Матэрыялы да слоўніка» (Ч. 2, 2010) на прыкладзе тэкстаў СМІ падае 22 значэнні Д. скл. і 30 адрозных значэнняў М. скл. у канструкцыях з прыназоўнікам *па.* У некаторых адзінках ёсць варыянтнасць: *(па) закону/е, стандарце/ту* [16, с. 306–315]. В. І. Іўчанкаў заўважае выпадкі ўжывання форм *па тэлефону* ў газеце «Звязда» пры тым, што ў выданні пераважае *па тэлефоне* [17, с. 47–48]. Дамінаванне Д. скл. у сучасных выданнях Віцебшчыны адзначае Ю. М. Бабіч: *па **стану** на 25 ліпеня* [18, с. 318]. П. П. Жаўняровіч для ўзбагачэння тэкстаў СМІ моўнымі сродкамі рэкамендуе выкарыстанне сінанімічных канструкцый: *дапамога па правядзенні – у правядзенні* і пад. [6, с. 362–363]. Падобныя варыянты замены «празмерна» ўжытых «канцылярскіх выразаў» з прыназоўнікам *па* прапаноўваліся лінгвістам Н. Ю. Шведавай яшчэ ў 1960-х гг. [19, с. 44–52]. П. У. Сцяцко абгрунтоўваў пераклады *по закону* – у адпаведнасці з законам і інш. тым, што «прыназоўнік *па* не мае ў нашай мове такога пашырэння, як у расійскай» [8, с. 88–89].

**Мэта** артыкула – выяўленне ***дынамічных з'яў*** ва ўжыванні назоўнікаў м. р. у М. скл. ***у СМІ***, якія сталі нормай або, наадварот, засталіся перыферыйнай з'явай. Даследаванне праведзена на аснове аналізу статыстычных даных. З шасці разнапланавых выданняў (газеты «Звязда» (Зв.), «Культура» (К.), «Настаўніцкая газета» (Наст.), «Наша Ніва»[1] (НН), «Раніца» (Р), з 2012 гг. – дадатак да газеты «Переходный возраст» (Р-ПВ), часопіс «Бярозка» (Б.) – па 4 выпускі за 2001, 2006, 2011, 2015, 2019 гг.) былі выбраныя 124 словаформы асабовых назоўнікаў (*М. і В. скл.*), 271 словаформа назоўнікаў з асновай на *г, х (М. скл. і Д. скл.)*, а таксама 913 канструкцый з прыназоўнікам *па (М. і Д. скл.)*.

**Функцыянаванне асабовых назоўнікаў м. р.** За вызначаны перыяд у прэсе выяўляецца малая колькасць словаформ асабовых назоўнікаў м. р. М. скл. адз. ліку – 29. У газеце «Звязда» ёсць толькі 6 адзінак за перыяд 2015 і 2019 гг.: *аб заяўніку, аб праведніку* і інш., у газеце «Раніца» – адзіны прыклад *аб вядомым чалавеку* (2011), у Бярозцы – *у ворагу* (2006), *аб сваім выхаванц**ы*** (а не *-у*) (2011). Найбольшая колькасць назоўнікаў м. р. у М. скл. адзначана ў 2001 г. у «Нашай Ніве» (16 адзінак: *пры сакратару, у сваяку* і інш.), «Настаўніцкай газеце» (14: *у настаўніку, у чалавеку* і інш.), «Культуры» (9: *аб аўтар**ы***, *аб прататыпе* і інш.). Сярод словаформ М. скл. адзначана 7 (15 %) памылковых – прычым у назоўніках з рознымі тыпамі асноў (акрамя *г, к, х*). Так, сярод словаформ з асновай на цвёрды зычны 2 маюць канчатак *-у*: *аб сын**у*** (НН, 2011), *пры пасл**у*** (НН, 2019); выяўлены памылкі ў 4-х назоўнікаў з асновай на *р, ц*[2]: *па лектар**ы*** (Наст., 2001), *аб аўтар**ы*** (К., 2001), *аб сваім выхаванц**ы*** (Б., 2011), *пры дырэктар**ы*** (Наст., 2015), у адным назоўніку з асновай на мяккі зычны: *аб геро**і*** (Наст., 2019). Адхіленні ўказваюць на складанасці ў разуменні практыкамі правіла, калі асабовыя назоўнікі (акрамя назоўнікаў з цвёрдай асновай) маюць спецыфічныя флексіі. У сувязі з рэкамендацыямі двух канчаткаў для назоўніка *дзед*, канчатак *-у* расцэньваецца як варыянтны. *Кожнага ведаеце мала што па імені, дык яшчэ і па бацьку,* ***па дзеду,*** *па дзецях, па справах* (Зв., 07.03.2015, с. 4). Трэба адзначыць, што амаль палова з 48 асабовых назоўнікаў у М. скл., зафіксаваных у вызначаны перыяд, – гэта адзінкі з асновай на *г, к,* дзе магчымы толькі адзін канчатак *-у*: *пры герцагу, аб дакладчыку, у ворагу*.

Мяркуем, што адна з прычын рэдкага ўжывання форм асабовых назоўнікаў М. скл – практычная матывацыя журналістаў: імкненне пазбегнуць памылак. Верагодна, з гэтым можна звязаць перавагу у 1,6 разу над канструцыямі *аб* + М. скл. ужыванняў *пра* + асабовы назоўнік В. скл. з канчаткамі *-а (-я)*: *уражанні* ***пра*** *іерарха*, *расказаць* ***пра*** *галоўнага* ***агранома***, *даведацца* ***пра князя*** *Вітаўта, клопатаў* ***пра*** *хворага* ***мужа***. Заўважым, што колькасць словаформ з прыназоўнікам *аб* пераважала ў 2001 г. у «Нашай ніве», «Настаўніцкай газеце», а таксама ў «Нашай ніве» за 2019 г., у «Звяздзе» у 2015 і 2019 гг. была роўнай з *пра*. Аднак спалучэнне *пра* з галоўным назоўнікам, які ўказвае на афіцыйна-дзелавы стыль, не зусім удалае: *…Рабіў вялікае* ***расследаванне пра*** *генпракурора Расіі Юрыя Чайку і дваіх яго сыноў* (nn.by, 11.03.2019).

Калі ахарактарызаваць ужыванне неасабовых назоўнікаў м. р. з *аб/пра* ў выбраных СМІ, то ў выданнях, дзе ёсць афіцыйная хроніка («Звязда», «Наша ніва», «Настаўніцкая газета»), агульная колькасць ужыванняў *аб* ад 36 да 75 %. Пры гэтым заўважылася пранікненне словазлучэнняў з *пра* ў тэксты навін і аб'яў: *паведамілі пра інцыдэнт* (НН, 2019), *інфармацыя пра расклад* (Наст., 2019). Верагодна, выбар прыназоўніка ў залежнасці ад семантыкі галоўнага слова становіцца непрынцыповым:

[1] З 2019 г. «Наша ніва» выходзіць толькі ў інтэрнэце.

[2] Не выяўлена прыкладаў назоўнікаў з асновай на шыпячыя і з асновай на *х*.

*сведчыць аб агульным узроўні / пра лёс засведчыла* (Р-ПВ, 2019). Спалучэнні з падпарадкаванымі адушаўлёнымі неасабовымі назоўнікамі характэрныя для літаратурных твораў: *памяць пра барана* (Б., 2019), *казка пра аднавухага зайца* (К, 2015).

Нячастае ўжыванне асабовых назоўнікаў з М. скл. можна патлумачыць і спецыфікай сэнсавых адносін. Сярод адзінкавых прыкладаў з прыназоўнікам *па* – значэнні адпаведнасці: *пазнаеце па каларытным прафесару*, роднаснасці: *дзеткі па сыне*, размеркавальныя: *па адным жыхару*. Адзначана рэалізацыя наступных значэнняў з прыназоўнікамі *у, на, пры*: *у* – ‘аб’ект, у якім сцвярджаецца пэўная ўласцівасць’: ***У** модным **юнаку** ўжо нічога не нагадвала хлопчыка са звычайнай вясковай хаты ў Вязынцы* (Зв., 17.03.2015, с. 4); *на* – ‘аб’ект, на які распаўсюджваецца дзеянне’: *Усю ўвагу майстар скіроўвае **на салдаце**, паказваючы яго ва ўвесь рост* (К., 14.03.2015, с. 15), *пры* – ‘асоба, у прысутнасці якой што-н. адбываецца’: *пры новым кіраўніку.*

**Ужыванне назоўнікаў м. р. з асновай на *г, х*.** У вызначаных матэрыялах СМІ з 271 словаформы назоўнікаў з асновай на *г, х* у М. скл. адз. л. зафіксавана 72 адзінкі з канчаткам *-е* і марфаналагічным чаргаваннем [*г*] – [*з’*], [*х*] – [*с’*]. Пераважна гэта ўжыванні ўласнабеларускіх назоўнікаў: *на беразе* (39 паўтораў), *на (у) снезе* (9), *на парозе* (7), *на паверсе* (6), *па (на) крузе* (3), *па (на) лузе* (3), *на версе* (1), *у стозе* (1). Заўважаны і нешматлікія адхіленні: канчатак *-у* замест рэкамендаванага *-е*: *на Журавінскім лу**гу*** (Р, 2015), *па кру**гу*** (К., 2015) і, наадварот, *-е* ў слове *страх*: *Сабак ён* [*мядзведзь*] *трымаў у **страсе** божым…* (Б., № 7. 2011, с. 37). Не выклікае праблем для практыкі шырокая група ўласнабеларускіх назоўнікаў, якія абазначаюць дзеянні, абстрактныя паняцці і канкрэтныя прадметы: *у забегу, у граху, на імху, у мозгу, мараць аб поспеху, аб працягу*.

Дастаткова стабільна з канчаткам *-у* ўжываюцца даўнія і новыя запазычанні: *на рынгу, у эпілогу, у альманаху, на мітынгу*, *у маніторынгу*. Захаванне асновы неалагізма ў склонавай форме дапамагае разумець пачатковую форму: *у буккросінгу*, *па армрэслінгу*, *на кастынгу, у рэйтынгу*. Прыкладаў адзінак са змякчэннем асновы ўсяго 2: *У сваім **блозе** крыху раней ён пісаў…* (Наст., 12.03.2011, с. 6); *Таму нічога дзіўнага ў дыялёзе жанчыны з доктарам няма (НН, 02.03.2006, с. 38).* Іншамоўныя словы м. р. з канчаткам *-е* ў М. скл. адз. ліку эпізадычна фіксуюцца і ў іншых выданнях: ***На** вайсковым **слэнзе** гэты медаль часта называлі «Дзякуй, што сышлі!»* (lepel-kraj.by, 13.02.2019).

**Канструкцыі *па* + неасабовы назоўнік м. р.** Падлікі ўжывання канструкцый з прыназоўнікам *па* ў СМІ, паказалі, што перавага Д. скл. назіралася ў 2001–2006 гг. у газеце «Звязда» (табліца): *план па экспарту паслуг, па хакею, па узроўню даходаў, па фальклору*. *Каэфіцыент тэхнічнай гатоўнасці **па аўтатранспарту** за 2005 г. склаў 0,86* (Зв., 28.02.2006, с. 2). Ва ўсіх выданнях можна было сустрэць паралельнае ўжыванне форм: *па густу / па праспекце* (Р., 2001), *па пальцу / па перыметры* (Б., 2001). Пачынаючы з 2011 г., формы М. скл. пачынаюць дамінаваць у большасці значэнняў: аб’ектных (найчасцей): *экспедыцыі па зборы рэгіянальных традыцый, інструктар па фітнесе*, адпаведнасці: *прыём па агульным конкурсе*, *выязджаць па абмене*, інструмента дзеяння: *размовы па скайпе*, *глядзеў па тэлевізары*, прасторавых: *хадзіць па лесе,* часавых: *па стане на 16 студзеня*, размеркавальных: *па адным зялёным коласе.* Неасабовыя назоўнікі з асновай на *г, к, х,* дзе не адбываецца чаргаванне з [з’], [с’], маюць аднолькавы канчатак *-у* ў Д. і М. скл. У сувязі з тым, што ў выразах, дзе няма дапасаванага азначэння: *блізкіх па духу, прагулялася па парку, кантэнт па хэштэгу*, складана вызначыць дакладны склон, яны вынесеныя ў табліцы ў асобную калонку. Прыклады з выразнымі характарыстыкамі залічаныя як адпаведныя пэўнаму склону: *па гітарным гуку*, *па крузе* – М. скл., *па ўтворанаму замочку*, *па іншаму шляху* – Д. скл. Заўважым, што ў дадатку «Раніца» за 2019 г. усяго 1 прыклад з *па*: *па старадаўнім рэцэпце*, у «Культуры» за 2019 г. адзіны прыклад з Д. скл. – назва польскага фальклорнага фестывалю «*Алень **па бору** ходзіць*».

*Табліца* – **Колькасць ужытых у СМІ канструкцый прыназоўнік *па* + неасабовы назоўнік м. р. з М. і Д. склонамі**

| Выданне | Год | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2001 | | | 2006 | | | 2011 | | | 2015 | | | 2019 | | |
| | М. | Д. | г, к, х | М. | Д. | г, к, х | М. | Д. | г, к, х | М. | Д. | г, к, х | М. | Д. | г, к, х |
| Бярозка | 13 | 12 | 3 | 23 | 3 | 7 | 25 | 2 | 6 | 18 | 0 | 9 | 13 | 0 | 3 |
| Звязда | 6 | 42 | 4 | 7 | 27 | 11 | 41 | 5 | 6 | 26 | 0 | 3 | 37 | 0 | 9 |
| Настаўніцкая | 16 | 22 | 3 | 14 | 7 | 2 | 28 | 0 | 0 | 27 | 0 | 6 | 26 | 0 | 0 |
| Наша ніва | 21 | 4 | 1 | 26 | 2 | 1 | 27 | 0 | 2 | 23 | 0 | 0 | 24 | 0 | 3 |
| Культура | 26 | 0 | 6 | 27 | 4 | 4 | 41 | 0 | 7 | 32 | 0 | 2 | 31 | 1 | 2 |
| Раніца (ПВ) | 13 | 5 | 2 | 33 | 3 | 5 | 15 | 0 | 1 | 4 | 0 | 1 | 1 | 0 | 0 |

**Заключэнне.** Такім чынам, ва ўжыванні назоўнікаў м. р. у М. скл. адз. ліку ў сучасных беларускіх СМІ характэрна паступовае змяншэнне выпадкаў адхіленняў і неапраўданай варыянтнасці. Гэта звязана і з пераходам новых з’яў у норму (канструкцыі *па* + назоўнік *м. р.* маюць *М. скл.*, а не *Д. скл.* і *М. скл.*), і, наадварот, адхіленнем некаторых навацый (формы *М. скл. адз. л.* запазычаных назоўнікаў на *г, х* кшталту *у блозе*, *на слэнзе* – адзінкавыя). Сярод рэдкаўжывальных форм асабовых назоўнікаў у М. скл. – 15 % памылковых. Нізкая частотнасць у СМІ асабовых назоўнікаў у М. скл., вера-

годна, звязана з практычным імкненнем пазбегнуць памылкі, магчымасцю выкарыстаць сінанімічныя канструкцыі *пра + В. скл*. Па прычыне спецыфікі журналісцкага тэксту выкарыстанне прыназоўніка *пра* або *аб* можа не звязвацца з пэўным стылем мовы.

### Літаратура


1. *Шкраба, І. Р*. Варыянтнасць у сучаснай беларускай мове / І. Р. Шкраба. – Мінск : Асар, 2004. – 239 с.
2. *Клімаў, І. П.* Лінгвістычная апазіцыя двух стандартаў беларускай літаратурнай мовы / І. П. Клімаў // Роднае слова. – 2004. – № 7. – С. 14–18.
3. *Малько, Г. І.* Руска-беларуская марфалагічная інтэрферэнцыя ў сучасным беларускім перыядычным друку / Г. І. Малько // Веснік БДУ. Сер. 4. Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – Мінск : БДУ. – 2003. – № 3. – С. 75–79.
4. *Малько, Г. І.* Інтэрферэнцыйныя з'явы ў беларускамоўных тэкстах часопіса «Беларуская думка» ў 2008 годзе / Г. І. Малько // Русский язык : система и функционирование (к 70-лет. филолог. фак.) : сб. материалов IV Междунар. науч. конф., Минск, 5–6 мая 2009 г. : в 2 ч. / Белорус. гос. ун-т ; редкол. : И. С. Ровдо (отв. ред.) [и др.]. – Минск : РИВШ, 2009. – Ч. 2. – С. 264–267.
5. *Шчасная, К. Д.* Дынаміка словазмяняльнай нормы назоўнікаў у беларускай мове і сучасная моўная практыка : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук : 10.02.01 / К. Д. Шчасная ; Цэнтр даслед. беларус. культ., мовы і літ. НАН Беларусі. – Мінск, 2013. – 24 с.
6. *Жаўняровіч, П. П.* Даведнік па літаратурнай праўцы : арфаграф., пунктуац., лексіч., марфалаг., сінтаксіч., тэхніч. узроўні / П. П. Жаўняровіч. – Мінск : Адук. і вых., 2017. – 447 с.
7. *Абабурка, М. В.* Размежаванне часцін мовы і іх граматычных форм / М. В. Абабурка. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2015. – 120 с.
8. *Сцяцко, П. У.* Культура мовы / П. У. Сцяцко. – Мінск : Тэхналогія, 2002. – 444 с.
9. *Хромчанка, А. Р.* Сам сабе граматыка / А. Р. Хромчанка // Журналістыка-2010: стан, праблемы і перспектывы : матэрыялы 12-й Міжнарод. навук.-практ. канф., Мінск, 8–9 снеж. 2010 г. / рэдкал. : С. В. Дубовік (адк. рэд.) [і інш.]. – Вып. 12. – Мінск : БДУ, 2010. – С. 218–220.
10. *Каўрус, А. А.* Тэма, якая не страчвае актуальнасці. Пра ўжыванне прыназоўнікаў / А. А. Каўрус // Роднае слова. – № 1. – 2020. – С. 41–44.
11. Слоўка за слоўкам : алфавітны даведнік / А. А. Міхневіч [і інш.]. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2006. – 166 с.
12. Сучасная беларуская мова. Марфалогія : дапаможнік для студ. устаноў вышэйш. адук. / Беларус. дзярж. ун-т; рэд. З. І. Бадзевіч, В. П. Русак. – Мінск : БДУ, 2018. – 322 с.
13. Кароткая граматыка беларускай мовы : у 2 ч. / НАН Беларусі, Ін-т мовазнаўства ; навук. рэд. А. А. Лукашанец. – Мінск : Беларус. навука, 2007–2009. – Ч. 1 : Фаналогія. Марфаналогія. Марфалогія. – 2007. – 351 с.
14. *Юносова, В. О.* Специфіка вживання варіантних закінчень місцевого відмінка іменників чоловічого роду в мові сучасних ЗМІ / В. О. Юносова // Наука ІІІ тисячоліття : пошуки, проблеми, перспективи розвитку : матеріали ІІ Міжнарод. наук.-практ. інтернет-конф., Бердянськ, 25–26 квіт. 2018 р. – Бердянськ : БДПУ, 2018. – Ч. 2. – С. 168–169.
15. *Копров, В. Ю.* Вариантные формы в русской грамматике / В. Ю. Копров. – М. : Флинта: Наука, 2017. – 135 с.
16. *Канюшкевіч, М. І.* Беларускія прыназоўнікі і іх аналагі. Граматыка рэальнага ўжывання. Матэрыялы да слоўніка : у 3 ч. / М. І. Канюшкевіч. – Гродна: ГрДУ імя Я. Купалы, 2010. – Ч. 2: Дыяпазон М–П. – 619 с.
17. *Іўчанкаў, В. І.* Месны склон у медыятэксце: атрыбутыўны абвесны спосабу і сродку камунікацыі / В. І. Іўчанкаў // Слова ў кантэксце часу : матэрыялы IV Міжнарод. навукова-практ. канф., прысв. 90-годдзю А. І. Наркевіча, Мінск, 14–15 сак. 2019 г. / Беларус. дзярж. ун-т, рэдкал.: В. М. Самусевіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2019. – С. 46–49.
18. *Бабіч, Ю. М.* Некаторыя асаблівасці мовы і стылю рэгіянальных перыядычных выданняў Віцебшчыны / Ю. М. Бабіч // Рэжым доступу: http://elib.psu.by:8080/bitstream/123456789/19535/1/Бабіч_с317-321.pdf. – Дата доступу: 15.03.2019.
19. *Шведова, Н. Ю.* Активные процессы в современном русском синтаксисе / Н. Ю. Шведова. – М. : Просвещение, 1966. – 156 с.


### References


1. *Shkraba, I. R.* Varyyantnasts u suchasnaj belaruskaj move / I. R. Shkraba. – Minsk : Asar, 2004. – 239 s.
2. *Klimau, I. P.* Lingvistychnaya apazicyya dvuh standartau belaruskaj litaraturnaj movy / I. P. Klimau // Rodnae slova. – 2004. – № 7. – S. 14–18.
3. *Malko, G. I.* Ruska-belaruskaya marfalagichnaya interferencyya u suchasnym belaruskim peryyadychnym druku / G. I. Malko // Vesnik BDU . Ser. 4. Filalogiya. Zhurnalistyka. Pedagogika. – Minsk : BDU. – 2003. – № 3. – S. 75–79 .
4. *Malko, G. I.* Interferencyjnyya zyavy u belaruskamounyh tekstah chasopisa «Belaruskaya dumka» u 2008 godze / G. I. Malko // Russkij yazyk : sistema i funktsionirovanie (k 70-let. filolog. fak.) : sb. materialov IV Mezhdunar. nauch. konf., Minsk, 5–6 maya 2009 g. : v 2 ch. / Belorus. gos. un-t ; redkol. : I. S. Rovdo (otv. red.) [i dr.]. – Minsk : RIVSH, 2009. – Ch. 2. – S. 264–267.
5. *Shchasnaya, K. D.* Dynamika slovazmyanyalnaj normy nazounikau u belaruskaj move i suchasnaya mounaya praktyka : autaref. dys. … kand. filalag. navuk : 10.02.01 / K. D. Shchasnaya ; Tsentr dasled. belarus. kult., movy i lit. NAN Belarusi. – Minsk, 2013. – 24 s.
6. *Zhaunyarovich, P. P.* Davednik pa litaraturnaj praucy : arfagraf., punktuac., leksich., marfalag., sintaksich., tekhnich. uzrouni. / P. P. Zhaunyarovich. – Minsk : Aduk. i vyh., 2017. – 447 s.
7. *Ababurka, M. V.* Razmezhavanne chastsin movy i ih gramatychnyh form / M. V. Ababurka. – Magilyou : MDU imya A. A. Kulyashova, 2015. – 120 s.
8. *Stsyacko, P. U.* Kultura movy / P. U. Stsyacko. – Minsk : Tekhnalogiya, 2002. – 444 s.
9. *Hromchanka, A. R.* Sam sabe gramatyka / A. R. Hromchanka // Zhurnalistyka-2010 : stan, prablemy i perspektyvy : materyyaly 12-j Mizhnarod. navuk.-prakt. kanf., Minsk, 8–9 snezh. 2010 g. / redkal. : S. V. Dubovik (adk. red.) [i insh.]. – Vyp. 12. – Minsk : BDU, 2010. – S. 218 – 220.
10. *Kaurus, A. A.* Tema, yakaya ne strachvae aktualnasci. Pra uzhyvanne prynazounikau / A. A. Kaurus // Rodnae slova. – № 1. – 2020. – S. 41 – 44.
11. Slouka za sloukam : alfavitny davednik / A. A. Mihnevich [i insh.]. – Minsk : Vyd. centr BDU, 2006. – 166 s.
12. Suchasnaya belaruskaya mova. Marfalogiya : dapamozhnik dlya stud. ustanou vyshejsh. aduk. / Belarus. dzyarzh. un-t; red. Z. I. Badzevich, V. P. Rusak. – Minsk : BDU, 2018. – 322 s.
13. Karotkaya gramatyka belaruskaj movy : u 2 ch. / NAN Belarusi, In-t movaznaustva ; navuk. red. A.A. Lukashanets. – Minsk : Belarus. navuka, 2007–2009. – Ch. 1 : Fanalogiya. Marfanalogiya. Marfalogiya. – 2007. – 351 s.
14. *Yunosova, V. O.* Specifika vzhivannya variantnih zakinchen miscevogo vidminka imennykiv cholovichogo rodu v movi suchasnyh ZMI / V. O. Yunosova // Nauka III tysyacholittya : poshuky, problemy, perspektyvy rozvytku : materialy II Mizhnarod. nauk.-prakt. internet-konf., Berdyansk, 25–26 kvit. 2018 r. – Berdyansk : BDPU, 2018. – Ch. 2. – S. 168–169.
15. *Koprov, V. Yu.* Variantnye formy v russkoj grammatike / V. Yu. Koprov. – M. : Flinta: Nauka, 2017. – 135 s.
16. *Kanyushkevich, M. I.* Belaruskiya prynazouniki i ih analagi. Gramatyka real'naga uzhyvannya. Materyyaly da slounika : u 3 ch. / M. I. Kanyushkevich. – Grodna: GrDU imya Ya. Kupaly, 2010. – CH. 2: Dyyapazon M–P. – 619 s.1.
17. *Iuchankau, V. I.* Mesny sklon u medyyateksce: atrybutyuny abvesny sposabu i srodku kamunikatsyi / V. I. Iuchankau // Slova u kantekstse chasu : materyyaly IV Mizhnarod. navukova-prakt. kanf., prysv. 90-god. A. I. Narkevicha, Minsk, 14 – 15 sak. 2019 g. ; Belarus. dzyarzh. un-t, redkal.: V. M. Samusevich (adk. red.) [i insh.]. – Minsk : BDU, 2019. – S. 46–49.
18. *Babich, Yu. M.* Nekatoryya asablivastsi movy i stylyu regiyanalnyh peryyadychnyh vydannyau Vicebshchyny / Yu. M. Babich // Rezhim dostupa: http://elib.psu.by:8080/bitstream/ 123456789/19535/1/Babich_s317-321.pdf. – Data dostupu: 15.03.2019.
19. *Shvedova, N. Yu.* Aktivnye processy v sovremennom russkom sintaksise / N. Yu. Shvedova. – M. : Prosveshchenie, 1966. – 156 s.